# ЗОЛАТА НАШАЙ КУЛЬТУРЫ

**У Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі 22 сакавіка адбылася прэзентацыя серыі кніг «Нарысы гісторыі культуры Беларусі» ў 4 тамах (пад навуковай рэдакцыяй акадэміка НАН Беларусі Аляксандра Лакоткі), а таксама кнігі Валянціны Бялявінай і Любові Ракавай «Беларускі касцюм». Спынімся на першай.**





Як адзначыў А.Лакотка, стварэнне падобнага чатырохтомніка было абумоўлена попытам на такую тэматыку і вялося пяць гадоў. Дарэчы, паралельна з гэтым праектам, які завяршыўся ў мінулым годзе, рыхтавалася энцыклапедыя «Культура Беларусі». Выданні не дубліруюць адно аднаго, а гарманічна дапаўняюць. «Гэта сапраўдны творчы подзвіг», – так ахарактарызаваў вынік галоўны вучоны сакратар НАН Беларусі Аляксандр Кільчэўскі, які прыйшоў на імпрэзу павіншаваць гуманітарыяў.

«Прыспеў час паказаць усяму свету нашу багатую культуру. І сялян, і шляхты, і іншых слаёў грамадства», – падкрэсліў А.Лакотка. Гэта стала адпраўным пунктам стварэння першага тома «Нарысаў», які прысвечаны пытанням паходжання, фарміравання і развіцця шляхецкай культуры.

Другі том асвятляе тэматыку архітэктуры гарадоў і мястэчак, турыстычны патэнцыял іх гісторыка-культурнай спадчыны, сямейнага і грамадскага побыту гараджан, адукацыі, гарадскіх легенд і паданняў, а таксама грамадскіх аб'яднанняў (пажарных, санітарных, дабрачынных, асветніцкіх і г. д.). Асобна даследуюцца тэатральная і музычная культура гарадоў, мастацкая адукацыя.

У трэцім томе разглядаюцца асаблівасці эвалюцыі культуры беларускага сяла. Кніга першая прысвечана матэрыяльнай культуры, другая – духоўнай, складаецца з больш чым дванцаці раздзелаў, у якіх даследуюцца археалагічныя культавыя помнікі дахрысціянскага перыяду, міфы пра чараўнікоў і ведзьмаў, народныя ўяўленні пра знахарства, замовы ды інш.

Апошні том – пра культуру XX – пачатку XXI ст. Тут усебакова прадстаўлены працэсы фарміравання культуры, яе структуры і марфалогіі. Аналізуюцца тэндэнцыі і вопыт, этапы эвалюцыі і асаблівасці айчыннай архітэктуры, прафесійнага выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, традыцыйных мастацкіх рамёстваў, экранных, музычнага і тэатральнага мастацтваў.

«Важна, што ў ліку аўтараў (а ўсяго іх – 51) – і прадстаўнікі нашых ВНУ», – зазначыў А. Лакотка. Гэта надала выданню шматграннасць, а супрацоўнікі Выдавецкага дома «Беларуская навука» прыклалі максімум намаганняў, каб багата ілюстраваная серыя стала ўзорам айчыннага кніжнага мастацтва.

Вынік не застаўся незаўважаным – сёлета серыя «Нарысы...» стала пераможцам нацыянальнага конкурсу «Мастацтва кнігі» ў намінацыі «Духоўнасць». Раней кнігі серыі ўжо атрымлівалі ўзнагароды разнастайных конкурсаў. Наперадзе – новыя цікавыя праекты.

***Сяргей ДУБОВІК***
***Фота аўтара, «Навука»***